**Человек в социокультурном измерении. 2023;1:34–38**
**Human in the Socio-Cultural Dimension. 2023;1:34–38**

*УДК 316.77;008*

# КУЛЬТУРНАЯ ТРАЎМА ЯК УМОВА ДЛЯ КАНСТРУЯВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

***А. Д. КРЫВАЛАП***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, вул. Рабкараўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжаны феномен культурнай траўмы як умовы для канструявання культурнай ідэнтычнасці. Тэарэтычным падмуркам сталі працы такіх даследчыкаў, як Дж. Ч. Александэр, Ч. Айдын, Р. Эйерман, П. Штомпка і Г. Маркузэ. Прапанаваны магчымыя інтэрпрэтацыі разумення культурнай траўмы ў якасці істотнай часткі дынамічнага працэсу стварэння культурнай ідэнтычнасці як на індывідуальным, так і на калектыўным узроўні. Прадстаўлена аўтарская спроба паказаць магчымыя сувязі паміж разуменнем культурных выклікаў, якія з'явіліся ў постіндустрыяльную эпоху (Г. Маркузэ), і трактоўкай канцэпцыі культурнай траўмы (Дж. Ч. Александэр). Канструяванне культурнай ідэнтычнасці спрыяе пошуку адказаў на пытанні адносна магчымасцей для пераасэнсавання ўласнага мінулага, што дазваляе паскорыць надыход будучыні.

***Ключавыя словы:*** культурная траўма; культурная ідэнтычнасць; памяць; будучыня.

# КУЛЬТУРНАЯ ТРАВМА КАК УСЛОВИЕ ДЛЯ КОНСТРУИРОВАНИЯ КУЛЬТУРНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ

***А. Д. КРИВОЛАП***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет культуры и искусств, ул. Рабкоровская, 17, 220007, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрен феномен культурной травмы как условия для конструирования культурной идентичности. Теоретическим фундаментом стали работы таких исследователей, как Дж. Ч. Александер, К. Айдин, Р. Эйерман, П. Штомпка и Г. Маркузе. Предложены возможные интерпретации понимания культурной травмы в качестве неотъемлемой части динамического процесса создания культурной идентичности как на индивидуальном, так и на коллективном уровне. Представлена авторская попытка показать возможные связи между пониманием культурных вызовов, возникших в постиндустриальную эпоху (Г. Маркузе), и трактовкой концепции культурной травмы (Дж. Ч. Александер). Конструирование культурной идентичности облегчает поиск ответов на вопросы о возможностях переосмысления собственного прошлого, что позволяет ускорить наступление будущего.

***Ключевые слова:*** культурная травма; культурная идентичность; память; будущее.

**Образец цитирования:**
Крывалап АД. Культурная траўма як умова для канструявання культурнай ідэнтычнасці. *Человек в социокультурном измерении.* 2023;1:34–38.
https://doi.org/10.33581/2709-5738-2023-1-34-38

**For citation:**
Krivolap AD. Cultural trauma as a condition for the construction of cultural identity. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2023;1:34–38. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2709-5738-2023-1-34-38

**Автор:**
***Алексей Дмитриевич Криволап*** – кандидат культурологии; доцент кафедры культурологии факультета культурологии и социально-культурной деятельности.

**Author:**
***Alexei D. Krivolap***, PhD (cultural studies); associate professor at the department of cultural studies, faculty of cultural studies and socio-cultural activities.
*email2krivolap@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-4478-4930*

# CULTURAL TRAUMA AS A CONDITION FOR THE CONSTRUCTION OF CULTURAL IDENTITY

*A. D. KRIVOLAP*[a]

[a]*Belarusian State University of Culture and Arts, 17 Rabkaraŭskaja Street, Minsk 220007, Belarus*

The article is devoted to understanding of cultural trauma phenomenonfor the construction of cultural identity. As a theoretical foundation, the works of such researchers as J. C. Alexander, C. Aydin, R. Eyerman, P. Sztompka, H. Marcuse are used. The article suggests possible interpretations of the understanding of cultural trauma as an integral part of the dynamic process of creating cultural identity, both at the individual and collective levels. The author's attempt is also presented to show possible connections between understanding the challenges that arose in the post-industrial era for culture (H. Marcuse) and the concept of cultural trauma (J. C. Alexander). The construction of cultural identity facilitates the search for answers to questions about the possibilities of rethinking one's own past, which makes it possible to accelerate the onset of the future.

***Keywords:*** cultural trauma; cultural identity; memory; future.

## Уводзіны

У дыскурсе сацыяльна-гуманітарных дысцыплін размовы пра культурную траўму актуалізаваліся ў 2000–2020 гг. Можна лічыць, што ўсё пачалося з публікацыі вынікаў даследавання стваральніка моцнай праграмы культурсацыялогіі Дж. Ч. Александэра, у якім ён паказваў сувязі паміж культурнымі траўмамі і калектыўнымі ідэнтычнасцямі. Сацыёлаг прадставіў дзве асноўныя стратэгіі разважання пра траўму: псіхааналітычны падыход, які разглядае наяўнасць траўм у дзяцінстве як крыніцу шматлікіх неўрозаў і маній, і філасофію Асветніцтва, якая тлумачыць траўму як рацыянальную рэакцыю на шокавыя змены ў грамадстве. У выпадку калі траўмы былі абсалютна рэальнымі і калі немагчыма спрачацца пра ступень іх рэалістычнасці, магчыма спакусіцца падобным натуралістычным разуменнем. Аднак замест падобнай некрытычнай версіі паходжання культурнай траўмы Дж. Ч. Александэр прапанаваў больш глыбокую інтэрпрэтацыю. Дыскусія не грунтуецца на пытанні аб тым, ці была траўма ў рэальнасці, а пераходзіць на больш высокі ўзровень канцэптуалізацыі траўмы як сацыяльна-культурнай з'явы.

На яго думку, «культурная траўма ўзнікае, калі члены супольнасці адчуваюць, што яны падвергліся жудаснай падзеі, якая пакідае непазбыўныя сляды ў іх групавой свядомасці, назаўсёды пазначаючы іх успаміны і фундаментальна і незваротна змяняючы іх будучую ідэнтычнасць»[1] [1, p. 85]. Такое вызначэнне культурнай траўмы можна лічыць рабочым, яно будзе выкарыстоўвацца як зыходны пункт у разважаннях аўтара дадзенага артыкула на гэты конт.

Мэта артыкула – паказаць ролю культурнай траўмы ў працэсе канструявання культурнай ідэнтычнасці. Пры гэтым не абавязкова, каб траўма была фактам рэальнасці, а не чарговым сацыяльным канструктам, які выступае рэальным для значнай колькасці індывідаў.

## Тэарэтычныя асновы культурнай траўмы

Існуе парадаксальнае падабенства паміж культурнай ідэнтычнасцю і культурнай траўмай: яны маюць амбівалентны характар, выступаючы адначасова на індывідуальным і калектыўным узроўнях. Кожная траўма – гэта вельмі персанальная гісторыя, якая можа быць выкарыстана для стварэння ўласнай індывідуальнай ідэнтычнасці як адметнасці і магчымасці адрозніцца ад *Іншых*. Таму важным будзе пытанне аб тым, якім чынам адбываецца пераход з індывідуальнага ўзроўню на калектыўны ўзровень.

Для індывіда культурным шокам, які абумоўлівае ўзнікненне асабістай культурнай траўмы, можа быць любое непрадбачанае і нечаканае дзеянне, на якое свядомасць чалавека проста не паспявае адрэагаваць адпаведным чынам, а таксама сітуацыя, што не ўкладваецца ў галаве і (ці) здараецца знянацку. Для з'яўлення калектыўнай траўмы неабходны іншы збег акалічнасцей (іншы не па маштабе, таму што калектыўная траўма – гэта не арыфметычная сума індывідуальных траўм). Маецца на ўвазе прынцыпова іншая з'ява. Калектыўная траўма можа ўзнікнуць і без шокавага стана індывідаў. Гэта запаволенае асэнсаванне ці схаванае разуменне далейшай немагчымасці былога сацыяльна-культурнага ўкладу ці прыняцце зруйнаванага стану сацыяльных стасункаў, калі былой супольнасці, да якой мог належаць індывід, больш няма. У выніку замест *Мы* з'яўляецца мноства атамізаваных *Я*, і кожны з іх сам за сябе. Супольнасці, якая існавала раней, цяпер няма. У такім выпадку пацярпелым з'яўляецца кожны, проста не ўсе паспелі

[1]Тут і далей пераклад наш. – *А. К.*

адрэфлексаваць маштаб таго, што адбылося. І тут можа быць карысным зварот да псіхааналітычнага тлумачэння траўмы: праблема можа быць вырашана «шляхам не толькі навядзення парадку ў свеце, але і навядзення парадку ў сабе» [1, p. 89]. Калі гэта не адбудзецца, то свядомасць будзе працягваць адмаўляць наяўнасць праблемы праз выцясненне ўспамінаў аб з'яве, якая траўміруе, у падсвядомасць і спрабаваць вярнуцца ў папярэдні стан, дзе траўмы яшчэ няма.

Дж. Ч. Александэр падкрэсліваў, што «…падзеі самі па сабе не ствараюць калектыўнай траўмы. Яны па сваёй сутнасці нетраўматычныя. Траўма – сацыяльна апасродкаваная атрыбуцыя» [1, p. 91]. У некаторых выпадках для ўсталявання падобных атрыбуцый патрэбен час, іншым разам гэта сувязь можа з'явіцца непасрэдна падчас разгортвання падзей, а ў некаторых выпадках усё можа адбыцца імгненна. Важную ролю ў хуткасці дадзенай трансфармацыі адыгрываюць тэхналогіі камунікацыі. Адна справа, калі інфармацыя пра жахлівыя падзеі распаўсюджваецца з істотным спазненнем, і зусім іншая, калі ўсё адбываецца ў прамым эфіры і аўдыторыя медыя з'яўляецца сведкам катастрофы.

Пераход з індывідуальнага ўзроўню на калектыўны ўзровень асэнсавання траўмы магчымы, калі індывідуальнае пачынае разглядацца як сацыяльнае. Да таго часу пакуль супольнасць можа дазволіць сабе ігнараваць пакуты асобных індывідаў ці груп, гэта будзе траўмай некаторых індывідаў. Але ўсё можа імкліва змяніцца, калі дадзеная праблема пачне ўспрымацца як праблема культурная, якая закранае ўсіх. Гэта феномен рэпрэзентацыі і калектыўнага ўяўлення. Наколькі траўмы перажываюцца, а значыць, уяўляюцца і рэпрэзентуюцца, настолькі і калектыўная ідэнтычнасць падвяргаецца перманентнаму пераасэнсаванню. Дж. Ч. Александэр пісаў: «Ідэнтычнасці ўвесь час канструююцца і забяспечваюцца з дапамогай сутыкнення твар у твар з сучаснасцю і будучыняй, а таксама праз рэканструкцыі больш ранніх перыядаў жыцця супольнасці» [1, p. 103]. Канструяванне ідэнтычнасці, якое будзе грунтавацца на бясконцых адсылках да мінулага, рана ці позна прывядзе да пытанняў адносна будучыні. Спрабуючы вырашыць пытанні з мінулым, устанавіць гістарычную справядлівасць, зрабіўшы тое, што лічыцца правільным, культуры могуць нечакана для саміх сябе сутыкнуцца з выклікамі будучыні. І гэтыя выклікі магчыма разглядаць з дапамогай не толькі канцэпцыі выклікаў і адказаў А. Дж. Тойнбі, але і падыходу П. Штомпкі і яго разумення культурнай траўмы (сацыялагічны напрамак).

У зборніку «Культурная траўма і калектыўная ідэнтычнасць» П. Штомпка звяртаўся да феномена траўмы сацыяльных змен у посткамуністычных грамадствах. Трансфармацыя ці змены ў сферы культуры з'яўляюцца атрыбутыўнай характарыстыкай грамадства. Сацыёлаг пісаў: «Анталагічна грамадства ёсць не што іншае, як змяненне, рух і трансфармацыя, дзеянне і ўзаемадзеянне, будаўніцтва і рэканструкцыя, пастаяннае станаўленне, а не стабільнае быццё» [2, p. 155]. І гэта ўпісваецца ў канцэпцыю сацыяльнага станаўлення П. Штомпкі. На яго думку, «траўматычныя ўмовы або сітуацыі заўсёды культурна сканструяваны» [2, p. 165]. Калі чалавек успрымае сітуацыі як рэальныя, то яны будуць мець абсалютна сапраўдныя наступствы для яго. Пры гэтым культурная траўма можа выступаць адначасова адмоўнай і станоўчай з'явай: як непазбежнае наступства траўматагеннага характару і як стымул для ўтварэння шэрагу іншых трансфармацый у якасці адказу і пераадолення атрыманай траўмы. У дачыненні да пытання ідэнтычнасці культурныя траўмы з'яўляюцца фактарам, які актывізуе паўторны запуск працэсу ідэнтыфікацыі, калі ідэнтычнасць разглядаецца як працэс, а не стан. Калі працэс пераасэнсавання не запускаецца, а траўма выціскаецца і ігнаруецца, то істотна павышаецца рызыка рэцыдыву і абвастрэння з цягам часу. Таксама гэта можа спрыяць утварэнню заганнай спіралі культурнай дэструкцыі, якая ўзмацняе сама сябе і абвастрае траўматычныя сімптомы. Такім чынам, характар праяўлення наступстваў культурнай траўмы ў значнай ступені залежыць ад асабовых якасцей індывіда: адукацыі, культурных кампетэнцый, сацыяльных сувязей і інш.

## Паміж уяўленнем і рэальнасцю культурнай траўмы

Адной з праблем выкарыстання і разумення канцэпцыі культурнай траўмы можа быць недакладна акрэсленая ступень рэальнасці падзей. Віртуальныя дзеянні могуць мець абсалютна рэальныя наступствы.

Першапачаткова разважанні пра культурныя траўмы, якія ўплываюць на трансфармацыю культурнай ідэнтычнасці, тычыліся, бясспрэчна, рэальных падзей (напрыклад, даследаванне Р. Эйермана «Культурная траўма. Рабства і фарміраванне афраамерыканскай ідэнтычнасці» [3]). Рабства ў ЗША было адменена ў XIX ст., але рэха гэтага траўматычнага досведу магчыма пачуць і ў XXI ст. Культурная траўма рабства існуе не столькі ў трагедыях індывідаў, а ў тым, што створаныя адпаведныя сацыяльныя інстытуты для культывацыі, рэпрэзентацыі і ўзнаўлення расавай дыскрымінацыі не зніклі аўтаматычна пасля адмены рабства. Практыкі памяці і забыцця непасрэдным чынам закранаюць мінулае і перафарміроўваюць нашы ўспаміны, рэдагуючы іх у адпаведнасці з наяўнымі нормамі і кантэкстам сучаснасці.

Р. Эйерман працягвае даследаваць узаемадачыненні паміж памяццю, культурнай траўмай і ідэнтычнасцю і ў сваім аналізе выходзіць далёка за межы глабальнай па катастрафічнасці ўласных наступстваў

праблемы рабства і расавай дыскрымінацыі. Праблема калектыўнай траўмы для сучаснага грамадства разглядаецца на прыкладах, якія ўзніклі на працягу XX ст.: вайна ў В'етнаме, катынскі расстрэл, халакост. Пры гэтым культурная траўма прэтэндуе на асобную ролю ў сацыяльнай тэорыі, дакладней на тое, каб інтэрпрэтацыя сацыяльнай тэорыі адбывалася праз оптыку тэорыі траўмы. Калі раней наяўнасць траўмы магла ігнаравацца, то зараз яна значна ўплывае на працэс інтэрпрэтацыі сацыяльнага жыцця: «У гэтым новым кантэксце асабістая траўма і культурная траўма зліваюцца» [4, p. 105].

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і спрэчныя моманты працэсу глабалізацыі, «...мара аб касмапалітычным свеце не памерла. Моцная надзея на стварэнне глабальнай грамадзянскай сферы застаецца» [5, p. 164]. Праяўленне гэтай мары магчыма заўважыць у шматлікіх рэпрэзентацыях глабалізацыі, калі яна выступае ў якасці новай формы сацыяльнай рэальнасці. Іншымі словамі, яна не проста адбываецца ў сусветным маштабе, але і стварае адпаведныя культурныя формы. Да такіх форм рэпрэзентацыі адносяцца і буйныя калектыўныя культурныя траўмы, якія прызнаюцца ва ўсім свеце.

Глабальны характар культурных траўм выяўляецца ў наступным: перамогі лакальных нацыянальна-вызваленчых рухаў у сярэдзіне XX ст. спрыялі з'яўленню таго, што сёння называюць посткаланіяльным станам свету. Абсалютна відавочна, што практыкі каланізацыі можна разглядаць як калектыўную траўму. І адной з прыярытэтных задач магло б быць пераадоленне каланіяльнага мінулага. Аднак практыкі дaследавання сацыяльна-культурнага стану былых калоній паказалі, што фізічная адсутнасць каланізатараў не з'яўляецца вырашэннем праблемы каланіяльнага мінулага. Культуры, якія маюць траўму каланізацыі, перманентна імкнуцца вярнуць мінулае, у якім значна лягчэй зразумець, хто ёсць ахвяра, а хто – драпежнік. Імкненне забыць траўмы каланізацыі часам спрыяе сімвалічнаму вяртанню фігуры каланізатараў. Варта адзначыць, што траўма каланізацыі будзе адбівацца як на каланізаваных культурах, так і на саміх каланізатарах. Гэта з'ява разглядаецца на прыкладах такіх краін, што маюць траўматычны досвед каланізацыі, як Бельгія, Італія, Нідэрланды, Партугалія, Францыя і Японія [6]. І ў гэтым кантэксце варта згадаць тэкст Ч. Айдына пра тое, як забыць незабыўнае, калі размова ідзе пра калектыўную траўму і культурную ідэнтычнасць. Рызыкі сацыяльна-культурных праблем, якія могуць узнікнуць у выніку забыцця мінулага, перавышаюць станоўчыя фактары. Ч. Айдын паказваў, якім чынам «траўма можа прывесці да перапынку і разрыву ў фарміраванні ідэнтычнасці... якую ролю адыгрывае немагчымасць забыцця ў дэструктыўным уплыве траўмы на ідэнтычнасць» [7, p. 128]. Так, каланіяльны досвед немагчыма забыць, і таму працэс траўміравання будзе працягвацца. Замест забыцця неабходна прапрацоўка траўмы.

## Культурная траўма і пераадоленне прынцыпу рэальнасці

У дадзеным артыкуле канцэпцыя культурнай траўмы і культурнай ідэнтычнасці разглядаецца і праз псіхааналітычны падыход у інтэрпрэтацыі Г. Маркузэ. Гэта сведчыць як мінімум пра тры аспекты, якія дазваляюць наблізіць падыход Дж. Ч. Александэра да канцэпцыі Г. Маркузэ, а таксама даследаваць працэсы канструявання культурнай ідэнтычнасці ў параўнанні з працай над пераадоленнем культурнай траўмы ў грамадстве.

Першым аспектам выступае глабальны характар падпарадкавання культуры «прынцыпу рэальнасці», які стварае глабальнае вымярэнне культурнай траўмы. Паводле Г. Маркузэ, «цывілізацыя рухаецца да самазнішчэння, паколькі ў яе падмурку знаходзіцца адмова ад задавальнення патрэб» [8, c. 78]. Гэта тычыцца не толькі пэўнай культуры, але і ўсёй сучаснай цывілізацыі. Як пісаў Дж. Ч. Александэр, «...калектыўныя траўмы не маюць геаграфічных або культурных межаў. Тэорыя культурнай траўмы без шкоды для чыіх-небудзь правоў можа быць прыменена ва ўсіх сітуацыях і выпадках, калі грамадствы сканструявалі і перажылі або не сканструявалі і не перажылі культурныя траўматычныя падзеі» [1, p. 107].

Другім аспектам з'яўляецца атрыбутыўны характар памяці і забыцця, калі селекцыя і выцясненне ў падсвядомасць нязручных успамінаў ператвараюць мінулае, якое выклікае разуменне будучыні. На думку Г. Маркузэ, «...не прымірэннем з сучаснасцю павінна заканчвацца вызваленне мінулага... арыентацыя на мінулае пераходзіць у арыентацыю на будучыню. Пошук страчанага часу становіцца сродкам дасягнення будучага вызвалення» [8, c. 23].

Трэці аспект – гэта справядлівасць і салідарнасць, якія разам ствараюць аснову маральнага вымярэння глабальных культурных траўм. Дж. Ч. Александэр пісаў, што, «адмаўляючы рэальнасць пакут іншых, сацыяльныя групы не толькі змяншаюць сваю адказнасць за іх пакуты, але часта і перакладаюць адказнасць за свае ўласныя пакуты на гэтых іншых» [1, p. 85]. Аднак пазіцыя Г. Маркузэ наконт гэтага значна больш радыкальная: «Забыць – значыць дараваць тое, што не падлягае прабачэнню з пазіцыі справядлівасці і свабоды. Такое прабачэнне адраджае ўмовы, якія ўзнаўляюць несправядлівасць і рабства: забыцца на мінулы боль – значыць дараваць тым, хто прычыніў яго, пакінуўшы іх пераможцамі. Раны, якія лечацца часам, утрымліваюць яд» [8, c. 201].

Прымаючы пад увагу згаданае вышэй, магчыма выказаць меркаванне аб тым, што канцэпцыя культурнай траўмы Дж. Александэра можа выступаць як працяг пошуку адказу на наступнае пытанне Г. Маркузэ: «Ці магчыма стварыць грамадства паводле прынцыпу задавальнення, а не прынцыпу рэальнасці?»

## Высновы

Культурная ідэнтычнасць не мае ўніверсальнага характару і лакалізавана на розных узроўнях культурнай практыкі штодзённасці індывідаў, тады як культурная траўма не можа быць абмежавана выключна адміністрацыйнымі межамі той ці іншай культуры і імкнецца да глабальнага вымярэння. Культурная ідэнтычнасць трактуецца як частка працэсу рэпрэзентацыі і носіць перфарматыўны характар. Яна не ствараецца ў якасці статычнага варыянта падабенства да якога-небудзь ідэальнага аб'екта, а з'яўляецца дынамічнай часткай працэсу асэнсавання і канструявання сябе ў працэсе рэпрэзентацыі.

Стварэнне культурнай ідэнтычнасці тут і зараз непазбежна выклікае неабходнасць выпрацоўкі адказаў на балючыя пытанні адносна разумення мінулага і пошукаў будучыні, калі праз пошукі страчанага магчыма знайсці будучае. Культура, як практыка, не проста заклікае да вяртання ў славутае мінулае, а прапануе праз яго пераасэнсаванне новыя праекты будучыні. Канструяванне культурнай ідэнтычнасці з'яўляецца часткай індывідуальнай практыкі штодзённага жыцця і прапрацоўкі індывідуальных і калектыўных траўм. Менавіта культурная практыка мае сэнс для ідэнтыфікацыі як працэсу сацыяльнага станаўлення. Канструяванне культурнай ідэнтычнасці патрабуе наяўнасці адпаведнай культурнай формы і пэўных прынцыпаў арганізацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Alexander JC. *The meanings of social life: a cultural sociology*. Oxford: Oxford University Press; 2003. 296 p.
2. Sztompka P. The trauma of social change: a case of postcommunist societies. In: Alexander JC, Eyerman R, Giesen B, Smelser NJ, Sztompka P. *Cultural trauma and collective identity*. Berkeley: University of California Press; 2004. p. 155–195.
3. Eyerman R. *Cultural trauma. Slavery and the formation of African American identity*. Cambridge: Cambridge University Press; 2002. 316 p.
4. Eyerman R. *Memory, trauma, and identity*. Cham: Palgrave Macmillan; 2019. 216 p.
5. Alexander JC. *Trauma. A social theory*. Cambridge: Polity; 2012. 240 p.
6. Eyerman R, Sciortino G, editors. *The cultural trauma of decolonisation. Colonial returnees in the national imagination*. Cham: Palgrave Macmillan; 2020. 246 p.
7. Aydin C. How to forget the unforgettable? On collective trauma, cultural identity, and mnemotechnologies. *An International Journal of Theory and Research*. 2017;17(3):125–137. DOI: 10.1080/15283488.2017.1340160.
8. Маркузе Г. *Эрос и цивилизация. Одномерный человек. Исследование идеологии развитого индустриального общества*. Юдин АА, переводчик; Кузнецов ВЮ, составитель. Москва: АСТ; 2003. 526 p.

## References

1. Alexander JC. *The meanings of social life: a cultural sociology*. Oxford: Oxford University Press; 2003. 296 p.
2. Sztompka P. The trauma of social change: a case of postcommunist societies. In: Alexander JC, Eyerman R, Giesen B, Smelser NJ, Sztompka P. *Cultural trauma and collective identity*. Berkeley: University of California Press; 2004. p. 155–195.
3. Eyerman R. *Cultural trauma. Slavery and the formation of African American identity*. Cambridge: Cambridge University Press; 2002. 316 p.
4. Eyerman R. *Memory, trauma, and identity*. Cham: Palgrave Macmillan; 2019. 216 p.
5. Alexander JC. *Trauma. A social theory*. Cambridge: Polity; 2012. 240 p.
6. Eyerman R, Sciortino G, editors. *The cultural trauma of decolonisation. Colonial returnees in the national imagination*. Cham: Palgrave Macmillan; 2020. 246 p.
7. Aydin C. How to forget the unforgettable? On collective trauma, cultural identity, and mnemotechnologies. *An International Journal of Theory and Research*. 2017;17(3):125–137. DOI: 10.1080/15283488.2017.1340160.
8. Marcuse H. *Eros i tsivilizatsiya. Odnomernyi chelovek. Issledovanie ideologii razvitogo industrial'nogo obshchestva* [Eros and civilisation. One dimensional person. Study of the ideology of a developed industrial society]. Yudin AA, translator; Kuznetsov VYu, compiler. Moscow: AST; 2003. 526 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 06.12.2022.*
*Received by editoral board 06.12.2022.*